**ДЗЕ́ДКА**, міфічная істота, якая ўвасабляе даравальніка багацця. Паводле вераванняў беларусаў, Дз. ходзіць удзень па дарозе з торбаю, як жабрак, і, сустрэўшыся з няшчасным ці бедным чалавекам, перш чым той паспее яго заўважыць, наводзіць на яго сон. Калі ж сустрэчны — багаты, але няшчасны, Дз. паказвае яму ў сне такія сродкі, якія могуць пазбавіць яго ад няшчасця. Галоўнай дзеючай асобай у сне Дз. паўстае сам, і чалавек адразу пазнае яго па чырвоных вогненных вачах і такой самай барадзе. Калі ж сустрэчны аказаўся бядняк, Дз., навёўшы на яго сон, патаемна забяспечвае яго неабходнай колькасцю грошай. Беларусы лічаць Дз. захавальнікам скарбаў, пацвярджаючы гэта шматлікімі апавяданнямі, нібыта ён з'яўляецца ўвечары, уночы і ўдзень на тым месцы, дзе закапаны нейкі скарб, у сваім звыклым абліччы, але не цалкам, а відаць адна толькі яго галава — таму, кажуць, агеньчык на скарбах бывае нібыта на паверхні самой зямлі. Здагадлівыя людзі, нічога не баючыся, смела падыходзяць да гэтага агеньчыка, ведаючы, што гэта паказаўся з зямлі Дз. з грашыма. Падышоўшы, трэба кінуць на яго нейкую адзежыну і абавязкова шапку; калі ж яе няма, то частку сваіх валасоў, вырваных з галавы. Неабазнаны чалавек можа кінуць нешта іншае. Калі хто кіне шапку ці валасы, скарб не пойдзе далёка, а застанецца амаль на паверхні зямлі; калі кіне світку — скарб апусціцца ў тры разы глыбей, а калі боты ці лапці — скарб пойдзе ад паверхні зямлі гэтак глыбока, што трэба будзе ўвесь свой век капаць зямлю на тым месцы, пакуль выкапаеш яго. Скарб тым глыбей пойдзе ў зямлю, чым далей ад галавы ці бліжэй да ног тая вопратка, якую кінеш на агеньчык. За такія шчодрасці Дз. беларусы прыпісвалі яму назву Дзедавай (мясапуснай) нядзелі. Казалі, нібыта іх продкі ўстанавілі яе ў гонар Дз. У нар. гаворках былі выказванні: «Каб не Дзедка — прапаў», «Дзедка дапамог гору».

*Літ.*: Древлянский П. [Шпилевский П.]. Белорусские народные поверья // Журн. М-ва нар. просвещения.1846. Прибавления. Кн. 1.

*У. А. Васілевіч.*

**ДЗЕ́ЖКА** Ян (?—1908), адзін з інфарматараў і карэспандэнтаў М.*Федароўскага.* Селянін з в. Новая Хадароўка Сакольскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Польшча). Дапамагаў М.Федароўскаму ў 1880—1908: паведаміў яму вялікую колькасць бел. фалькл.-этнаграфічных матэрыялаў. Выдатна расказваў, умела спяваў. Добра ведаў побыт народа, яго мову, звычаі, абрады і павер'і, вераванні, забабоны, вусна-паэтычную творчасць. Дасылаў фалькларысту песні, казкі, легенды і паданні, павер'і і забабоны, прыказкі і прымаўкі бел. сялян з Сакольшчыны, Ваўкавышчыны, Пружаншчыны. Друкаваўся ў газеце «Наша ніва». Перапісваўся з М.Федароўскім (без указання адрасата частка надрукавана ў т. 3 «Люду беларускага», 1903, № 527—528). Ад Дз. запісаны і апублікаваны ў «Людзе беларускім» 70 твораў апавядальных жанраў (у т. 2 — 10, у т. 3 — 60): казкі пра жывёл, чарадзейныя, бытавыя казкі, жарты, анекдоты, гістарычныя і тапанімічныя легенды і паданні. У яго рэпертуары найбольш шырока прадстаўлены сацыяльна-бытавыя, сатырычныя казкі і анекдоты з маральна-этычнымі і сацыяльнымі праблемамі. У некаторых сатырычных творах выкрываў служак культу, царкоўныя абрады, несправядлівых паноў. Творы Дз. вылучаюцца высокім майстэрствам, дынамічным развіццём сюжэта. Выдатна распрацаваны тэксты казак на вядомыя міжнародныя сюжэты пра ўпартую жонку (СУС 1365 В), паляўнічага, які лётаў на жоравах (СУС 1881), сам сябе выкопваў з багны (СУС 1882 А), пра мужыка, які прыйшоў да пана з рапартам (СУС 2040) і інш. Ад яго запісана таксама 19 песень: у т. 5—6 «Люду беларускага» (1958—60) апублікаваны радзінныя, вясельныя, валачобныя, жніўныя, жартоўныя, любоўныя, польскія песні і інш. Частка рукапісаў Дз. зберагаецца ў Рукапісным аддзеле бібліятэкі Варшаўскага універсітэта ў архіве М.Федароўскага. Запісаныя ад яго творы бел. фальклору папоўнілі тамы серыі БНТ «Казкі пра жывёл і чарадзейныя казкі» (1971), «Песні пра каханне» (1978), «Легенды і паданні» (1983), «Жарты, анекдоты, гумарэскі» (1984).

*Літ.*: Саламевіч Я. Міхал Федароўскі. Мн., 1972; Federowski M. Lud białoruski. T. 1—3. Kraków, 1897—1903; Тое ж. T. 5—6. Warszawa, 1958—60.

*К. П. Кабашнікаў, І. У. Саламевіч.*

**ДЗЕМІДО́ВІЧ** Павел Пятровіч (10.7. 1871, в. Мікалаеўшчына Стаўбцоўска-